**С. Я. Новікаў**

# СЕМ З ПАЛОВАЙ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ У ГІСТОРЫІ: ДА 75-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ МІНСКАГА ІНЯЗА

Сем з паловай дзесяцігоддзяў гісторыі з моманту стварэння Мінскага іняза (цяперашняга МДЛУ) пераканаўча сведчаць, што за гэты час установа адукацыі прайшла адметы шлях і набыла статус аднаго з самых вядомых лінгвістычных універсітэтаў на прасторы СНД, Еўропы і свету. Аўтар па прычыне абмежаванага памеру артыкула звяртае ўвагу чытача толькі на адну з першых старонак летапісу сталічнага інстытута замежных моў.

Свае вытокі ён пачынае ў гады першай пасляваеннай пяцігодкі, калі ў адпаведнасці з урадавымі пастановамі ў 1948 г. у Беларускай ССР упершыню быў адкрыты Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (МДПІЗМ), створаны на базе факультэта замежных моў МДПІ імя А. М. Горкага. За тры чвэрці існавання Мінскі іняз – МДЛУ падрыхтаваў звыш 40 тысяч настаўнікаў замежных моў і дзесяці тысяч перакладчыкаў-рэферэнтаў і спецыялістаў па міжнародных камунікацыях. Сярод выпускнікоў дзясяткі сусветна вядомых вучоных, дзяржаўных дзеячаў і заслужаных настаўнікаў Беларусі.

Стварэнне, станаўленне і развіццё ВНУ трывала звязана з дзейнасцю рэктараў, першым з якіх быў кандыдат эканамічных навук, дацэнт Жаўрыд Міхаіл Фядотавіч (1948–1960). У далейшым установу адукацыі ўзначальвалі Фрол Парфір’евіч Шмыгаў (1960–1970), Ніна Георгіеўна Краснова (1970–1990), Уладзімір Васільевіч Макараў (1990–1995) і Наталля Пятроўна Бара-

нава (1990–2020). З 2020 года пасаду рэктара займае кандыдат педагагічных навук, дацэнт Наталля Яўгеньеўна Лапцева.

Інстытут быў створаны ў адпаведнасці з Пастановай СМ СССР № 3485 ад 4 кастрычніка 1947 г. У рамках яе выканання на ўзроўні ўрада БССР прымаюцца пастанова СМ БССР ад 26 лістапада 1947 г. № 1686 і загад МА БССР ад 25 жніўня 1948 г. № 199. Як самастойная ВНУ ён пачаў функцыянаваць з 1 верасня 1948 г. у складзе 3 факультэтаў – англійскай, нямецкай і французскай моў і 8 кафедраў. У адпаведнасці з загадам міністра асветы Беларускай ССР П. В. Саевіча ад 25 жніўня 1948 г. было ўстаноўлена, што заняткі на 1 курсе пачнуцца 1 кастрычніка, тады як на старшых курсах – з 1 верасня 1948 г. Заняткі павінны былі праводзіцца ў другую змену ў памяшканні школы № 13 па вул. Пушкіна, 35, дзе ў першую змену навучаліся студэнты педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

Паводле загада Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР ад 21 красавіка 1949 г. № 476 і Міністэрства асветы БССР ад 29 красавіка 1949 г. № 68 у інстытуце адкрыта завочнае аддзяленне.

На момант узнікнення ў інстытуце быў арганізаваны Савет і створаны неабходныя структурныя падраздзяленні – рэктарат, вучэбная частка, навуковая частка, аддзел кадраў, бухгалтэрыя, канцылярыя, аддзел забеспячэння, гаспадарчая частка, бібліятэка. Намеснік дырэктара па навучальнай працы адначасова сумяшчаў пасаду дырэктара па навуцы. Прычым гэта практыка захоўвалася да сярэдзіны лістапада 1964 г., калі штатны расклад адміністрацыйна-кіруючага персаналу МДПІЗМ зацвярджаўся Міністэрствам вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР, уводзіліся адразу дзве пасады: прарэктара на вучэбнай і прарэктара па навуковай працы. Што азначала, што першым выконваючым абавязкі намесніка дырэктара з'яўляўся старшы выкладчык А П. Шлопак, які адначасова з'яўляўся загадчыкам кафедры англійскай мовы. Праз год на гэту пасаду быў прызначаны кандыдат гістарычных навук Ф. П. Шмыгаў, які прапрацаваў да 1952 г. Потым гэту пасаду займаў таксама кандыдат гістарычных навук А. А. Сарокін. Кіраўніцтва факультэтамі ажыццяўлялася двума дэканамі з дэканатамі факультэтаў англійскай і нямецкай моў. Факультэт французскай мовы ў сувязі са сваёй малалікасцю не меў дэканата, таму кіраўніцтва вялося дэканам англійскай мовы.

У першы 1948–1949 навучальны год заняткі ў інстытуце праходзілі ў другую змену ў будынку школы № 13 (вул. Пушкіна, 35) разам са студэнтамі МДПІ імя М. Горкага. Вучэбна-вытворчая база інстытута была надзвычай вузкай, таму ўвесь час прыходзілася працаваць у даволі цяжкіх умовах.

Амаль 10 гадоў спатрэбілася інстытуту для стварэння ўласнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Спачатку студэнты факультэта нямецкай мовы вучыліся ў інтэрнаце, уведзеным у эксплуатацыю па Омскім завулку з 1 верасня 1955 г. Заняткі ішлі таксама і ў школах горада, у адным з будынкаў БПІ

(праспект Сталіна, 79)[2]. У 1957–1958 вучэбным годзе інстытут размяшчаўся ў будынку былога педагагічнага вучылішча па вуліцы Захарава, 59, дзе часова арандаваліся два паверхі (першы паверх займала Рэспубліканская школа павышэння кваліфікацыі настаўнікаў).

У чэрвені 1958 г. прымаецца ў эксплуатацыю першы (на цяперашні час галоўны. – *С. Н.*) вучэбны корпус інстытута на вуліцы Захарава, 21. У ліпені інстытут перайшоў на новыя вучэбныя і адміністрацыйныя плошчы. Аднак адразу ж стала відавочным, што аўдыторнага фонду для заняткаў не хапала, таму яны праводзіліся ў 2 змены. У новым корпусе інстытута не было чытальнай залы і бібліятэкі, кніжны фонд, які на той момант складаў 165 тысяч адзінак кніг і часопісаў, з якіх колькасць кніг дасягнула лічбу ў 129 500 адзінак (у 1948 г. у фондах бібліятэкі было 3855 экзэмпляраў, перададзеных бібліятэкай МДПІ імя М. Горкага).

З першага навучальнага года кіраўніцтва інстытута бачыла асноўнымі задачамі сваёй дзейнасці падрыхтоўку высокаадукаваных спецыялістаў па замежных мовах (настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, рэферэнтаў, перакладчыкаў для работы ў розных установах); выкананне навукова-даследчых работ у вобласці філалогіі, педагогікі, псіхалогіі, гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі; стварэнне падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў; фарміраванне навукова-педагагічных кадраў; павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па замежных мовах, якія працуюць у сістэме народнай адукацыі і г.д. Развіццё інстытута звязвалі з арганізацыяй сістэматычных, планавых камандзіровак навуковых работнікаў у Маскву і Ленінград з мэтай павышэння тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню, авалодвання вопытам передавых інстытутаў Савецкага Саюза.

На 1948–1949 вучэбны год Міністэрствам вышэйшай адукацыі СССР для інстытута быў зацверджаны штат у 47 адзінак прафесарска-выкладчыцкага складу. Як адзначалася ў справаздачы аб рабоце інстытута за першы навучальны год, з 5 кафедраў інстытута толькі 2 узначальвалі кандыдаты навук, тады як астатнія – старшыя выкладчыкі пры гэтым па замежных мовах інстытут не меў навуковых супрацоўнікаў, якія б мелі вучоную ступень і вучонае званне. Нягледзячы на празмерныя цяжкасці ў арганізацыі і забеспячэнні вучэбнага працэсу, першы навучальны год у інстытуце прынёс пэўныя станоўчыя вынікі. На 1 курс у 1948 г. былі залічаны 158 студэнтаў, у тым ліку на факультэт англійскай мовы – 88, на факультэт нямецкай мовы – 40 і на факультэт французскай мовы – 40 студэнтаў. Усяго ў інстытуце на пачатак вучэбнага года навучаліся 408 студэнтаў, а на канец года – 364, з якіх на факультэце англійскай мовы – 204 студэнты, на факультэце нямецкай мовы – 86 і на факультэце французскай мовы – 74. У чэрвені 1949 г. факультэты зрабілі свой першы выпуск спецыялістаў па замежных мовах

[2] На цяперашні час гэта адзін з вучэбных будынкаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, у якім вядуцца заняткі па ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў гэтай установы адукацыі.

у колькасці 43 чалавек, з якіх выкладчыкаў англійскай мовы – 24, нямецкай мовы – 9 і французскай мовы – 10. Чатыры выпускнікі былі пакінуты для работы ў інстытуце ў якасці асістэнтаў.

Праз год пасля адкрыцця інстытута на 1 курс прынялі 165 студэнтаў, з якіх толькі 24 юнакі, 2 члены і кандыдаты ў члены КПСС, 108 камсамольцаў, 55 беспартыйных. Карціну па нацыянальнай прыналежнасці вызначалі наступныя звесткі: беларусаў – 94, рускіх – 36, украінцаў – 9, яўрэяў – 15, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей – 11. Па сацыяльнай прыналежнасці большасць прадстаўляла дзяцей служачых – 79, 42 студэнты, паходзілі з сямей рабочых, калгаснікаў – 15, сялян-аднаасобнікаў – 29. З заходніх абласцей БССР студэнтамі сталі 39 чалавек, 126 паходзілі з усходніх раёнаў і абласцей Беларусі. Сярод студэнтаў значыўся 1 інвалід Вялікай Айчыннай вайны, 7 былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У пераліку характарыстык значыліся вельмі адметныя пытанні аб тым, чым студэнты займаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны або ў час германскай акупацыі тэрыторыі рэспублікі. Вынікае, што 7 студэнтаў служылі ў Савецкай арміі, 2 былі ў партызанах, 69 знаходзіліся ў тыле, але больш за ўсё – 87 студэнтаў, ці больш паловы ўсяго набору, у час вайны пражывалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Такіх студэнтаў было роўна палова ад агульнай колькасці студэнтаў 1–4 курсаў, хто праз год пасля адкрыцця быў у складзе студэнтаў інстытута: на акупаванай тэрыторыі пражываў 231 студэнт, ці 50,1 % ад спісачнага складу студэнтаў.

Такім быў першы год з 75-гадовай гісторыі Мінскага іняза. Год, які ўпісаны імёнамі, справамі, падзеямі ў летапіс памяці, гонару і славы мінскіх інязаўцаў. На цяперашні час лінгвістычны ўніверсітэт – вядучая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных настаўнікаў і выкладчыкаў замежных моў, перакладчыкаў, спецыялістаў па міжкультурных камунікацыях.